УДК 930(438)

# АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМ УНІІ КАРАЛЕЎСТВА ПОЛЬСКАГА І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў 1385–1413 ГГ. У ДАСЛЕДАВАННЯХ ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 1940-Х – СЯРЭДЗІНЫ 1980-Х ГГ.

Мікалаева Л.В.
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»
(г. Мінск, Беларусь)

У артыкуле аналізуюцца асноўныя працы польскай гістарыяграфіі другой паловы 1940-х – сярэдзіны 1980-х гг., прысвечаныя вывучэнню розных аспектаў праблематыкі ўніі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў 1385–1413 гг. Робіцца выснова, што згаданая праблематыка, якая была прадметам разважанняў вялікай колькасці аўтараў, канчаткова не вычарпала ўсіх пытанняў і стварыла поле для даследаванняў наступных пакаленняў гісторыкаў.

Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае.

The article analyzes the main works of Polish historiography of the second half of the 1940s – mid-1980s, devoted to the study of various aspects of the union of the Kingdom of Poland and the Grand Duchy of Lithuania in 1385–1413. It is concluded that the above-mentioned issues, which have been the subject of reflection by many authors, have not completely exhausted all issues and created a field for research by future generations of historians.

Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania.

Польская гістарыяграфія другой паловы 1940-х – сярэдзіны 1980-х гг. утрымлівае вялікую колькасць прац, прысвечаных гісторыі Польшчы і яе саюза з Вялікім Княствам Літоўскім (далей – ВКЛ) на пачатковай яго стадыі. Было б бессэнсоўным пералічваць і абмяркоўваць усе даследаванні па гэтай тэматыцы. Разам з тым, неабходна адзначыць, што вывучэнню самой польскай гістарыяграфіі другой паловы 1940-х – сярэдзіны 1980-х гг. яшчэ не было нададзена належнай увагі. Гістарыяграфічнае ж становішча стае больш зразумелым, калі прааналізаваць у першую чаргу творы, якія фарміравалі гістарыяграфічную традыцыю і вызначалі пэўныя тэндэнцыі даследаванняў.

Абмеркаванне асноўных праблем, звязаных з пачаткам польска-літвінскага саюза, было б дарэчы пачаць з даследаванняў, прысвечаных падзеям 1385–1413 гг. У агульным выглядзе праблематыка першых актаў польска-літвінскай уніі закраналася ў кожнай больш-менш значнай сінтэтычнай гістарычнай працы. Пры гэтым польскія навукоўцы зыходзілі з меркавання, што без больш падрабязнага вывучэння сувязей Польшчы і ВКЛ у 1385–1413 гг. веды па гісторыі першай з краін не будуць поўнымі. З улікам вялікай колькасці такіх прац, толькі ў якасці прыкладу можна прывесці даследаванні З. Вайцяхоўскага [1], Ю. Бардаха [2], К. Тымянецкага [3], Е. Выразумскага [4], В. Чаплінськага [5]. Звесткі пра іх ёсць і на старонках апісання гісторыі ВКЛ пяра Е. Ахманьскага [6]. Спецыяльнае даследаванне, адлюстроўваўшае новы

погляд на праблему польска-літвінскага саюза, напісаў Ю. Бардах [6]. У ім ён прадставіў свой пункт гледжання на палажэнні, якія змяшчаліся ў актах, што вызначалі палітыка-юрыдычныя адносіны абедзвюх дзяржаў. Таксама імкнуўся адказаць на прынцыповае пытанне, якое ўжо шматразова ставілася гісторыкамі: ці быў крэўскі акт інкарпарацыяй? З разважанняў аўтара вынікала, што ёю не быў, у доказ чаго Ю. Бардах прывёў шмат цікавых аргументаў. Гэтым праблемам было адведзена пэўнае месца ў вельмі цікавай працы, якая датычыла польскага Сярэднявечча, «Polska dzielnicowa i zjednoczona. Państwo – społeczeństwo – kultura», апублікаванай у 1972 г. пад рэдакцыяй А. Гейштара [7]. Адзін з яе раздзелаў утрымліваў кароткае апісанне падзей 1385–1413 гг. [7, s. 313–368]. Цікавы погляд на гэту праблематыку таксама прэзентаваў Х. Самсановіч у сваім артыкуле, прысвечаным манархіі Ягелонаў [8]. Аўтар справядліва заўважыў, што польска-літвінская ўнія не была аднаразовым актам, спроба ўключэння ВКЛ у Польшчу была намерам нерэальным, аднак існавалі спрыяльныя абставіны, дзякуючы якім гэта аб’яднанне, нягледзячы ні на што, працягвала сваё існаванне. Толькі пасля Грунвальда пачаўся працэс аб’днання двух розных грамадстваў. На думку аўтара, яго пачатак можна ўбачыць у Гарадзельскай уніі 1413 г.

Нягледзячы на тое, што новых крыніц, якія дазвалялі б па-іншаму адлюстраваць ужо ўстаноўленыя факты ў палітычных адносінах ВКЛ і Польшчы, у разглядаемы перыяд не было ўведзена ў навуковы зварот, гэта не перашкодзіла працягваць па-новаму трактаваць прававыя і палітычныя праблемы ў польска-літвінскіх узаемаадносінах. У якасці прыкладу можна прывесці артыкул Х. Лаўмяньскага «Wielkie Księstwo Litewskie. Zagadnienia ustrojowe i prawne» [9].

Адной з прычын злучэння ВКЛ з Польшчай была неабходнасць атрымання моцнага саюзніка з мэтай супрацьстаяння Тэўтонскаму ордэну. У першыя гады ўніі на першы план выйшлі дзве важныя праблемы, звязаныя з гэтым. Першай была патрэба абароны тэрыторыі ВКЛ ад крыжацкіх планаў захопу Жамойці, другой – супрацьстаянне захадам разрыва ўніі і выступленням супраць Ягайлы на еўрапейскай арэне. Першая справа была вырашана падчас вайны 1409–1411 гг., пікам якой была бітва пад Грунвальдам. Яна ўжо шматразова была прадметам даследавання гісторыкаў. У разглядаемы перыяд бітва стала адмысловым полем дзейнасці С. М. Кучынскага. Аўтар прысвяціў гэтай праблеме шмат артыкулаў, а таксама комплекснае даследаванне, якое неаднаразова перавыдавалася пасля першай публікацыі ў 1955 г. [1]. З пункта гледжання ўдзелу прадстаўнікоў ВКЛ у вайне 1409–1411 гг. можна вылучыць дзве дэталёвыя працы С. М. Кучынскага. Першая датычыла задач, даручаных крылу войска ВКЛ падчас Грунвальдскай бітвы [11], другая апісвала ўмовы міру, завяршыўшага вайну і заключанага ў Торуні 1 лютага 1411 г. [12]. Рэзалюцыі мірнага пагаднення у першую чаргу былі выгадныя ВКЛ, якое вяртала, праўда, не на заўжды, Жамойць.

Справы абароны ВКЛ ад крыжакаў таксама былі прадстаўлены ў працах іншых аўтараў. Гэтаму было прысвечана вычарпальнае даследаванне Х. Лаўмяньскага, раскрываўшае гэту праблему з XII да XV ст. [13]. З гэтай

праблематыкай таксама было звязана вельмі карыснае і сур'ёзнае даследаванне, прысвечанае картаграфіі ВКЛ, апублікаванае С. Александровічам [14]. Асабліва важным для перыяда 1385–1413 гг. быў раздзел, прысвечаны вайсковым картам, а ў ім – заўвагі, якія датычылі картаў, паведамленняў разведчыкаў ці патэнцыяльных стратэгічных планаў, якія аблягчалі Ягайле выпрацоўку ваеннай стратэгіі.

Другая праблема, якая ўзнікла ў сувязі з польска-літвінскай уніяй і датычыла прадухілення крыжацкіх планаў разрыва ўніі, знайшла сваё адбіццё ў працы Л. Віноўскага [15]. Яна таксама знайшла ўвасабленне ў вельмі цікавай працы А. Ф. Грабскага [16]. У раздзеле «Geneza unii Polski z Litwą» гэты аўтар прадставіў крыжацкія захады, накіраваныя не толькі на настройванне вядучых еўрапейскіх двароў супраць Ягайлы, але таксама на падрыў яго пазіцый у папскай Курыі. У частцы працы, прысвечанай ацэнцы Грунвальда, даследчык апісаў дыпламатычныя сутычкі Польшчы і ВКЛ з Ордэнам адносна правільнага прадстаўлення еўрапейскай грамадскасці прычын і хода канфлікта 1409–1411 гг. [16, s. 179–292].

Разважанні на тэму адносін Польшчы і ВКЛ з Тэўтонскім ордэнам не могуць абыйсціся без апісання прац, якія датычылі дыпламатычнай дзейнасці абедзвюх дзяржаў. У гэтай галіне было створана комплекснае даследаванне «Historia dypłomacji Polskiej», выдадзенае пад рэдакцыяй Г. Лябуды [17]. У першым томе, прысвечаным Сярэднявеччу, адпаведныя раздзелы напісаў З. Х. Новак [17, s. 318–332].

Са злучэння Польшчы і ВКЛ вынікала неабходнасць прыняцця Вялікім Княствам пэўных інстытутаў ці ўрадаў, якія ўжо існавалі ў Польшчы. Ажыццяўленне дыпламатычнай дзейнасці, а таксама пратрэба выдачы вялікай колькасці дакументаў патрабавалі эфектыўнай дзейнасці канцылярыі. Да 1385 г. канцылярыя функцыянавала ў ВКЛ у абмежаваным выглядзе. Яе развіццё пасля заключэння ўніі было магчыма, дзякуючы перайманню польскіх прыкладаў у галіне дыктоўкі дакументаў, а таксама дзякуючы выкарыстанню польскага канцылярскага персанала. Грунтоўныя даследаванні па гэтай праблематыцы ажыццявіў М. Косман. Іх вынікам сталі шэраг прац, прысвечаных дакументам Ягайлы для ВКЛ [18], дыпломам Вітаўта [19; 20], а таксама камплекснае даследаванне пра вялікакняжацкую канцылярыю [21]. У апошнім даследчык выказаў меркаванне, што крэўскі акт пісалі дзве асобы [21, s. 99].

Праблематыкай пераймання ў ВКЛ польскага ўрада харужага займаўся В. Камянецкі. Яго даследаванне, якое было прысвечана з'яўленню ў пачатку XV ст. харужых у ВКЛ, указвала на іх польскае паходжанне. Узнікненне харужства вынікала з патрэб вайсковасці ВКЛ [22].

Таксама можна звярнуць увагу на некаторыя біяграфічныя працы. На першы план тут выйшлі дзве вядучыя постаці эпохі: кароль польскі і вялікі князь літошскі Уладзіслаў Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт, жыццю і дзейнасці якіх, аднак, былі прысвечаныя толькі працы М. Космана [23; 24] і С. М. Кучыньскага [25], меўшыя навукова-папулярны характар.

Мерай зацікаўлення польскімі даследчыкамі тэматыкай ВКЛ і польска-літвінскімі адносінамі сталі публікацыі даследаванняў, спецыяльна прысвечаных дадзенай праблематыцы. Гэта былі зборнікі артыкулаў, выдадзеныя пад рэдакцыяй аднаго гісторыка, альбо зборнікі даследаванняў, напісаных адным аўтарам. Да першай групы трэба аднесці том, выпушчаны пад рэдакцыяй вядомага даследчыка гісторыі ВКЛ Е. Ахманьскага [26]. Зборнік утрымліваў восем артыкулаў С. Александровіча, З. Вайтковяка, А. Кіяса, М. Мальчэўскай, М. Нэўмана, Е. Пурца, В. Пельтца, М. Б. Тапольскай, прысвечаных розным тэмам з гісторыі ВКЛ [27]. Да другой належалі сабраныя працы Ю. Бардаха, якія былі ўжо апублікаваныя асобна, а таксама фрагменты больш вялікіх прац і артыкулы Х. Лаўмяньскага [28]. Абодва зборнікі былі вельмі карыснымі выданнямі, якія вызначаліся багаццем і разнастайнасцю зместу.

Такім чынам, кола пытанняў, прысвечаныя вывучэнню розных аспектаў праблематыкі ўніі Каралеўства Польскага і ВКЛ у 1385–1413 гг., шырока адбілася ў польскай літуаністыцы другой паловы 1940-х – сярэдзіны 1980-х гг. Азначаная тэматыка ахвотна падымалася польскімі гісторыкамі. Аднак згаданая праблематыка, якая была прадметам разважанняў вялікай колькасці аўтараў, канчаткова не вычарпала ўсіх пытанняў і стварыла поле для даследаванняў наступных пакаленняў гісторыкаў.

Літаратура

1. Wojciechowski, Z. Państwo polskie w wiekach średnich. Dzieje ustroju/ Z. Wojciechowski. – Wyd. I. – Poznań : Księgarnia Akademicka, 1945. – 276 s.; Wyd. II, uzup. – Poznań : Księgarnia Akademicka, 1948. – 405 s.

2. Bardach, J. Historia Polski do r. 1466 / J. Bardach, A. Gieysztor, H. Łowmiański, E. Maleczyńska. – Wyd. IV. – Warszawa : Państwowe Zakłady Wydawnictw Szkolnych, 1960. – 375 s.

3. Tymieniecki, K. Polska w średniowieczu / K. Tymieniecki. – Warszawa : PWN, 1961. – 274 s.

4. Wyrozumski, J. Historia Polski do 1505 r. / J. Wyrozumski. – Warszawa : PWN, 1978. – 316 s.

5. Czapliński, W. Zarys dziejów Polski do r. 1864 / W. Czapliński. – Kraków : Znak, 1985. – 550 s.

6. Bardach, J. Krewo i Lublin. Z problemów unii polsko-litewskiej / J. Bardach // Kwartalnik historyczny. – 1969. – R. 76. – Z. 3. – S. 583–619.

7. Polska dzielnicowa i zjednoczona. Państwo – społeczeństwo – kultura / pod red. A. Gieysztora. – Warszawa : Wiedza powszechna, 1972. – 614 s.

8. Samsonowicz, H. Polska monarchia Jagiellonów: kraj, społeczeństwo, polityka / H. Samsonowicz // Przegląd Humanistyczny. – 1979. – R. 23. – Z. 7. – S. 73–88.

9. Łowmiański, H. Wielkie Księstwo Litewskie. Zagadnienia ustrojowe i prawne / H. Łowmiański // Kwartalnik Historyczny. – 1972. – R. 79. – Z. 4. – S. 885–896.

10. Kuczyński, S. M. Wielka wojna z Zakonem krzyżackim w latach 1409–1411 / S. M. Kuczyński. – Wyd. II. – Warszawa : Wydawn. Ministerstwa Obrony Narodowej, 1960. – 622 s.
11. Kuczyński, S. M. Taktyka walki skrzydła litewsko-ruskiego w bitwie pod Grunwaldem / S. M. Kuczyński // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. – 1964. – T. 10. – Cz. 2. – S. 35–46.
12. Kuczyński, S. M. Pierwszy pokój toruński (1 lutego 1411) / S. M. Kuczyński // Zapiski historyczne. – 1954. – T. 20. – Z. 1/4. – S. 139–165.
13. Łowmiański, H. Agresja Zakonu Krzyżackiego na Litwe w wiekach XII–XV / H. Łowmiański // Przegląd historyczny. – 1954. – T. 45. – S. 338–371.
14. Alexandrowicz, S. Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku / S. Alexandrowicz. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM, 1971. – 141 s.
15. Winowski, L. Sprawa stosunku do pogan w polsko-krzyżackim procesie z lat 1412–1414 / L. Winowski // Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Wrocławskiego. – 1956. – Seria A. – № 6. Prawo. – Z. II. – S. 99–117.
16. Grabski, A. F. Polska w opiniach Europy Zachodniej XIV–XV w. / A. F. Grabski. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1968. – 500 s.
17. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X–XX w.) : W 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych. Pod red. G. Łabudy. – Warszawa : PWN, 1982. – T. 1 : połowa X w. – 1572 / M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. H. Nowak, K. Zelewski. Pod red. M. Biskupa. – 875 s.
18. Kosman, M. Dyplomy Władysława Jagiełły dla Wielkiego księstwa Litewskiego / M. Kocman // Archeion. – 1968. – R. 48. – S. 45–59.
19. Kosman, M. Dokumenty łacińskie wielkiego księcia Witolda / M. Kocman // Archeion. – 1969. – R. 51. – S. 73–89.
20. Kosman, M. Dokumenty wielkiego księcia Witolda / M. Kocman // Studia Źródłoznawcze. – 1971. – T. 16. – S. 139–168.
21. Kosman, M. Kancelaria wielkiego księcia Witolda / M. Kocman// Studia Źródłoznawcze. – 1969. – T. 14. – S. 91–117.
22. Kamieniecki, W. Chorążowie w parlamentaryzmie litewskim przed unią lubelską / W. Kamieniecki // Antemurale. – 1965. – T. IX. – S. 165–203.
23. Kosman, M. Władysław Jagiełło / M. Kosman. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1968. – 290, [9] s.
24. Kosman, M. Wielki książe Witild / M. Kosman. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1967. – 279 s.
25. Kuczyński, S. M. Władysław Jagiełło 1350–1434 / S. M. Kuczyński. – Warszawa : Wydawn. Ministerstwa Obrony Narodowej, 1960. – 177 s.
26. Studia z dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku / pod red. J. Ochmańskiego // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. A. Mickewicza. – 1971. – Seria Historia. – № 74. – Z. 11.
27. Bardach, J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVI wieku / J. Bardach. – Warszawa: PWN, 1970. – 580 s.
28. Łowmiański, H. Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego/ H. Łowmiański. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM, 1983. – 579 s.